**27 лістапада журы падвяло вынікі IFMC-2022. У цэнтры Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску, як заўжды, — конкурсная праграма. А напярэдадні ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі зладзілі майстар-клас “Вялікі — IFMC. Балетны партнёрынг”.**



# Балетны партнёрынг

Майстар-клас, што прайшоў 21 лістапада, быў далёка не першым прыкладам супрацоўніцтва нашага Вялікага тэатра з віцебскім фестывалем. Больш за тое, іх шчыльнае партнёрства прасочваецца з 1990-х і выяўляецца ў розных формах — найперш праз удзел прадстаўнікоў тэатра як у працы журы, так і ў гасцявой, конкурснай праграмах форуму.

Сёлета тая традыцыя трансфармавалася ў згаданы майстар-клас, але не зусім звычайны. Уласна майстар-класам была хіба першая частка сустрэчы з харэографам Вольгай Пона і артыстамі Чалябінскага тэатра сучаснага танца, якім яна кіруе. Дарэчы, творца можа лічыцца выхаванкай IFMC: спачатку В. Пона прыязджала ў Віцебск удзельніцай-пачаткоўцам, потым яе пастаноўкі перамагалі ў конкурсе, іх запрашалі ў гасцявую праграму. Цяпер харэограф — лаўрэат прэстыжнай расійскай прэміі “Залатая маска”, адзін з суддзяў сёлетняга віцебскага спаборніцтва. Узначальваў журы галоўны балетмайстар Вялікага тэатра Беларусі, заслужаны артыст Расіі Ігар Колб, які выступіў адным з арганізатараў і мадэратараў майстар-класа.

Калі падчас занятку з навучэнцамі з усёй Беларусі акцэнт зрабілі на партнёрстве, працы з прасторай, кантакце з іншымі ўдзельнікамі, то ў фокусе другой часткі майстар-класа апынуліся фрагменты сольных спектакляў Чалябінскага тэатра. І “Дзюймовачка” ў выкананні Таццяны Крыцкай, прысвечаная канадскай танцоўшчыцы і харэографу Луізе Лекавальe (у гэтым годзе спектакль намінаваны на прэмію “Залатая маска”), і “Ірацыянальны” Дзмітрыя Чагадара раскрывалі вечную тэму пошуку чалавекам самога сябе, сваёй сутнасці, прызначэння, місіі. Нарэшце, індывідуальнасці. Пераасэнсаваная казачная гераіня, спачатку падобная да “брыдкага качаняці” ў красоўках, скарыстаных на манер пуантаў, на нашых вачах ператваралася ў прыгажуню лябёдачку з гнуткімі крыламі-рукамі, жаноцкімі закругленымі рухамі. Дый герой Д. Чагадара, “ірацыянальна” апрануты ў пінжак задам наперад, пазней прыходзіць да душэўнай “аголенасці”.

Калі ў гэтых пастаноўках панавала сумесь танца з побытавымі рухамі і дзеяннямі, гімнастыкай, пантамімай і іншымі з’явамі, дык “Першая сустрэча Воланда і Маргарыты” маладога харэографа, удзельніцы конкурсу і адначасова артысткі нашага Вялікага тэатра Настассі Голешавай вабіла неакласікай, багатай на сучасныя, часта нечаканыя падтрымкі, бліскуча выкананыя Марыяй Сірэнка і Аляксандрам Шахам. У кампазіцыі даследавалася ўсё тая ж тэма — асэнсавання сябе, свайго цела, патрэб і магчымасцей. І пазней на конкурсе ў Віцебску пастаноўка прайшла ў фінальны тур.

Трэцяй часткай майстар-класа была творчая сустрэча з расійскімі гасцямі. Імпрэза называлася “Стварэнне спектакля”, але ахапіла і іншыя актуальныя для моладзі пытанні.

Далей у час фестывалю і асабліва яго конкурснай праграмы балетнае партнёрства дапоўнілася здаровай канкурэнцыяй. І не толькі між удзельнікамі, але і між тымі, хто іх ацэньваў. Акрамя журы, якое выказвала думкі найперш праз непасрэднае вылучэнне пераможцаў, на форуме па традыцыі працаваў незалежны экспертны савет, што таксама аналізаваў убачанае.

— Назіраю за конкурсам шмат гадоў, хіба толькі з некаторымі перапынкамі, — распавяла адзін з чальцоў экспертнага савета, загадчык кафедры харэаграфіі БДУКМ, прафесар Святлана Гуткоўская. — Заўважна, што маладыя харэографы імкнуцца да сінтэзу мастацтваў — нават узаемазамяняюць танцоўшчыкаў і музыкантаў, выкарыстоўваюць цыркавыя элементы. Адзначу таксама схільнасць да мініяцюрнасці, сціспасці выказванняў, да мінімалістычных сродкаў, праз што некаторыя працы бачыліся эскізамі. Як і ў многія ранейшыя гады, былі праблемы з музычным суправаджэннем. Складалася ўражанне, што некаторыя пастаноўшчыкі ствараюць кампазіцыі ўвогуле без музыкі, а потым проста дадаюць штосьці безаблічна фонавае. Да таго ж многім здаецца, што чым больш складана, незразумела яны назавуць нумар, тым будзе лепш. Але папраўдзе глыбокіх, шматслойных па сэнсе філасофскіх нумароў аказалася не так многа, як, магчыма, хацелася б. Разам з тым, у параўнанні з ранейшымі падобнымі спаборніцтвамі, вельмі ўзрасла тэхнічнасць артыстаў: рухаюцца ўсе вельмі добра, і гэта павінна даваць харэографам дадатковыя магчымасці ў выяўленні думак.

Гран-пры паехала ў Цюмень. Падзеленая другая прэмія — у Тулу і Чалябінск. Астатнія лаўрэацкія званні дасталіся беларусам. Першае месца ўзялі праект Яўгеніі Нікалайчук з Мінска і ансамбль “Алеся” з Магілёва. Сталічны тэатр танца “Альтана” заняў трэцюю прыступку. А прэмію імя Яўгена Панфілава, якая традыцыйна ўручаецца найлепшаму харэографу, атрымаў Валянцін Ісакаў з Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў імя Н. Сакалоўскага за мініяцюру “Планета А”. Былі і іншыя ўзнагароды — разнастайныя спецыяльныя прызы.

Ды самы галоўны лаўровы вянок пакінулі ў Віцебску: дырэктар фестывалю Марына Раманоўская, якая яшчэ ў 1980-я ініцыявала творчы форум і ўсе гады застаецца нязменным натхняльнікам, арганізатарам і кіраўніком IFMC, прызнанага “Танцавальнай падзеяй года”, напярэдадні была адзначана III Нацыянальнай прэміяй у галіне сучаснай харэаграфіі “Крылы”. Урачыстасці з гэтай нагоды прайшлі 20 лістапада ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў, але ўшанаванне Марыны Генадзьеўны, зразумела, “пераехала” ў Віцебск.

— Пра высокі ўзровень фестывалю, — падзяліўся ўражаннямі старшыня журы IFMC-2022, галоўны балетмайстар Вялікага тэатра Беларусі, заслужаны артыст Расіі Ігар Колб, — сведчыць ужо тое, што ў конкурсе ёсць Гран-пры. Адзначу і адказнае стаўленне ўдзельнікаў да абранай тэмы. А тая нечакана аказалася нестандартнай і адначасова цалкам вытлумачальнай — каханне. Прычым у кожнага — з нейкім сваім бачаннем; філасофскім падтэкстам. Бо каханне так неабходна тут і цяпер, а ўсё астатняе — імгненнае, хуткаплыннае. І калі канкурсанты закранаюць тэму таго ж “Саларыса”, гэта толькі пацвярджае, што наша моладзь разважае больш глыбока, чым прынята думаць. Хачу пажадаць новаму пакаленню бязбоязна ісці наперад, не страчваць прынцыпаў і распрацоўваць уласны почырк у творчасці і выканальніцтве.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ